# ЮБІЛЕЙНЫЯ ДАТЫ

## ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ, ПАЭТ: ДА 60-ГОДДЗЯ В.І. РАГАЎЦОВА



У студзені гэтага года адзначыў сваё 60-годдзе загадчык кафедры беларускай мовы МДУ імя А.А. Куляшова, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, доктар філалагічных навук, прафесар Васіль Іванавіч Рагаўцоў.

В.І. Рагаўцоў нарадзіўся 4 студзеня 1952 г. у мястэчку Стрэшын Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. У 1973 г. закончыў Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут (цяпер дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна), а ў 1978 г. – аспірантуру ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР і праз год абараніў кандыдацкую дысертацыю "Выражэнне прычынных адносін сінтаксічнымі сродкамі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове (словазлучэнні з невытворнымі прыназоўнікамі)". Пасля заканчэння аспірантуры малады вучоны пачаў працаваць на кафедры беларускай мовы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (тады – педагагічнага інстытута) імя А.А. Куляшова, якую ўзначаліў у 1983 г. і якой загадвае па сённяшні час.

В.І. Рагаўцову пашанцавала з настаўнікамі і калегамі. Яго навуковым кіраўніком у аспірантуры быў адзін з найбуйнейшых айчынных лінгвістаў акадэмік М.В. Бірыла, а кафедрай, дзе пачаў працаваць учарашні аспірант, у розныя часы загадвалі вядомыя беларускія мовазнаўцы П.Я. Юргелевіч (1894 – 1973), Р.Н. Клюсаў (1916 – 1990), А.Л. Юрэвіч (1911 – 1986), якія разам са сваімі вучнямі і калегамі выпрацавалі навуковыя і педагагічныя традыцыі, што былі пакладзены ў аснову магілёўскай лінгвістычнай школы. Малады выкладчык арганічна ўпісаўся ў шэраг яе прадстаўнікоў.

У 2003 г. В.І. Рагаўцоў абараніў доктарскую дысертацыю "Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі" ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Вучоным упершыню ў беларускім мовазнаўстве была зроблена спроба найбольш поўна выявіць і комплексна прааналізаваць сродкі маўленчага выражэння камічнага ў даўняй і сучаснай беларускай драматургіі (XVII – XX стст.), а таксама акрэсліць найважнейшыя асаблівасці іх ужывання.

Абсяг навуковых інтарэсаў прафесара В.І. Рагаўцова ўражвае. Гэта і сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы, і лексіка беларускіх народных гаворак, і мова беларускай мастацкай літаратуры, і пытанні тэарэтычнай лінгвістыкі, і шмат іншых актуальных праблем беларускага і агульнага мовазнаўства. Плён навуковай працы юбіляра ўвасобіўся ў больш за 200 публікацыях: манаграфіі, слоўніках, артыкулах у энцыклапедыях, айчынных і замежных навуковых часопісах, зборніках навуковых прац і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тэме камічнага ў маўленні, грунтоўна распрацаванай вучоным у яго доктарскай дысертацыі, прысвечана манаграфія "Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі" (2002), а таксама "Слоўнік пра камічнае: мовазнаўчы аспект" (2010), у якім тлумачыцца больш за 210 тэрмінаў, што маюць дачыненне да камічнага як адной з катэгорый эстэтыкі (сутнасць, асноўныя віды, сродкі, спосабы і прыёмы вербальнага выражэння).

Значнае месца ў навуковай дзейнасці прафесара В.І. Рагаўцова займае лексікаграфія. Вучоны – аўтар унікальнага ў беларускім мовазнаўстве энцыклапедычнага даведніка "Мовы свету" (2009), у якім даюцца звесткі пра 400 найбольш распаўсюджаных моў свету, больш за 150 сем'яў і груп моў. Акрамя гэтага В.І. Рагаўцоў – сааўтар такіх грунтоўных даведнікаў, як "Матэрыялы да абласнога слоўніка Магілёўшчыны" (1981), "Анамастычны слоўнік Магілёўшчыны" (2000), "Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны" (2004), "Руска-беларускі слоўнік па машынабудаванні" (1998), "Мовазнаўцы МДУ імя А.А. Куляшова: агульнае і славянскае мовазнаўства (1930 – 2001): біябібліяграфічны даведнік" (2002).

Не менш уражвае і плён навукова-метадычнай дзейнасці прафесара В.І. Рагаўцова, якому належыць каля 30 вучэбных дапаможнікаў, тыпавых праграм, метадычных распрацовак для ВНУ па сучаснай беларускай літаратурнай мове, уводзінах у мовазнаўства, агульным мовазнаўстве і інш.

В.І. Рагаўцовым сумесна з А.Л. Юрэвічам быў падрыхтаваны першы дапаможнік па тэарэтычнай лінгвістыцы на беларускай мове "Уводзіны ў мовазнаўства" (1987), у якім асноўныя лінгвістычныя паняцці і тэрміны раскрываюцца пераважна на матэрыяле беларускай мовы. Вучоны – аўтар серыі навучальных дапаможнікаў па тэорыі мовы для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ: "Практыкум па ўводзінах у мовазнаўства" (1989), "Уводзіны ў мовазнаўства: заданні для самастойнай работы студэнтаў" (1992), "Практыкум па гісторыі агульнага мовазнаўства" (2001), "Уводзіны ў мовазнаўства: практыкум" (2003), "Уводзіны ў мовазнаўства" (2004), "Гісторыя мовазнаўства" (2005), "Агульнае мовазнаўства" (2006), "Агульнае мовазнаўства: практыкум" (2007), "Агульнае мовазнаўства: заданні для тэставага кантролю" (2009).

Вельмі папулярным сярод выкладчыкаў ВНУ і школьных настаўнікаў беларускай мовы з'яўляецца падрыхтаваны В.І. Рагаўцовым сумесна з С.Я. Кечык вучэбны дапаможнік "Моўны разбор у ВНУ і ў школе" (1988), у якім у параўнальным плане падаюцца схемы і ўзоры асноўных відаў моўнага разбору ў вышэйшай і сярэдняй школе, практыкаванні для самастойнага аналізу моўнага матэрыялу.

Пытанні сінтаксісу падрабязна разгледжаны вучоным у вучэбных дапаможніках для філалагічных факультэтаў ВНУ "Дыскусійныя пытанні сінтаксісу беларускай і рускай моў" (2000) і "Сінтаксіс беларускай і рускай моў: дыскусійныя пытанні" (2001), у якіх аналізуюцца спрэчныя і найбольш складаныя пытанні сінтаксісу, што вывучаюцца ў ВНУ ў курсах сучаснай беларускай і рускай літаратурных моў.

Прафесар В.І. Рагаўцоў выхоўвае навуковую і педагагічную змену, працягваючы традыцыі магілёўскай лінгвістычнай школы. Пад яго кіраўніцтвам было абаронена дзве кандыдацкія дысертацыі (выкладчыкаў нашага ўніверсітэта У.С. Дзянісава і А.М. Шубадзёравай), рыхтуюцца да абароны яшчэ дзве.

Шмат часу В.І. Рагаўцоў аддае і навукова-арганізацыйнай дзейнасці. Вучоны – член рэдкалегій навукова-метадычных часопісаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Роднае слова" (цяпер – навуковы кансультант) і "Беларуская

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мова і літаратура", навукова-метадычнага часопіса "Веснік МДУ імя А.А. Куляшова" і інш. Быў адным з кансультантаў энцыклапедыі "Беларуская мова" (1994), выдавецкім рэцэнзентам больш за 15 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па сучаснай беларускай мове для вышэйшай і сярэдняй школы, каля 10 тлумачальных і перакладных слоўнікаў.

Навуковая, навукова-педагагічная і навукова-арганізацыйная дзейнасць прафесара В.І. Рагаўцова атрымала высокую ацэнку калег і дзяржавы. У 1999 г. вучоны быў абраны членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. У 2002 г. узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Акрамя навуковых пошукаў, юбіляра, як усякага сапраўднага філолага, вызначае майстэрскае валоданне Словам. Літаратурная творчасць займае ў жыцці вучонага прыкметнае месца. В.І. Рагаўцоў – аўтар пяці паэтычных зборнікаў: "Сутонне" (1995), "Доляагляд" (1998), "Адмыслоўцы" (2007), "На роскрыжы дарог" (2008), "Імгненне і Вечнасць" (2010). Асобныя вершы паэта пакладзены на музыку кампазітарам М. Яцковым. У 1996 г. В.І. Рагаўцоў быў абраны сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі, а ў 2008 г. стаў лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Васіля Хомчанкі за зборнік вершаў для дзяцей "Адмыслоўцы" (2007).

Сёння прафесар і паэт Васіль Іванавіч Рагаўцоў знаходзіцца ў самым росквіце сіл. Хочацца шчыра пажадаць юбіляру і далей радаваць калег новымі навуковымі працамі, а прыхільнікаў мастацкага слова – новымі паэтычнымі творамі!

Я.Я. Іваноў,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова